# ІДЭАЛІЗАЦЫЯ ВАЙСКОВАЙ МОЦЫ ШЛЯХЦІЦА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў САРМАЦКІМ ПАРТРЭЦЕ

**Ю.Д. Царэвіч**
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

У XIV–XV стст. у Вялікім Княстве Літоўскім, як і ў большасці еўрапейскіх краін, фарміруецца рыцарскае саслоўе — магнаты і шляхта, якія нясуць вайсковую службу. Натуральным чынам змяняюцца этычныя і маральныя прыярытэты, культурная і мастацкая прастора краіны. Шляхецкі сармацкі светапогляд, фарміраванню якога ў дзяржаве садзейнічала асобае становішча шляхты ўзаконенае каралеўскімі артыкуламі і пастановамі, аказаў вялікі ўплыў на развіццё партрэтнага мастацтва Вялікага Княства Літоўскага.

Гістарычныя ўяўленні пануючых класаў грамадства ў XVI–XVII стст. знайшлі адлюстраванне ў фарміраванні ідэалогіі сарматызму, ідэалізацыі грамадска-палітычнага строю Вялікага Княства Літоўскага. Цэнтральнай катэгорыяй ідэалогіі сарматызму з’яўлялася катэгорыя «Айчына». Беларускую шляхту называлі шляхтаю-рыцарамі або воінамі-сарматамі (назва звязана з уяўленнямі шляхты аб сваім паходжанні ад ваяўнічых сармацкіх плямёнаў) сярод якіх панавала ідэя самаахвярнасці дзеля важнейшага абавязку – абароны Айчыны. Згодна соймікавай інструкцыі часоў уладарання Стэфана Баторыя «хто не здольны ахвяраваць сабою і не гатовы жыццё аддаць – той не шляхціц» [7]. Шляхціц мусіў заўсёды быць гатовым абараніць свой гонар ці гонар сваёй краіны ў асобе князя ці караля, якому ён служыў. Ён не меў нават маральнага права не выканаць гэтае прызначэнне. У адваротным выпадку ён аўтаматычна станавіўся ізгоем. Такім чынам удасканальвалася стаўленне да шляхецкай вайсковай культуры і сама вайсковая культура. Шляхціц павінен быў быць усебакова развітым, падрыхтаваны фізічна, ведаць вайсковую тактыку, што гарманізавалася з этычнасцю, маральнасцю паводзінаў.

Рысы сарматызму сталі панаваць ў сферы грамадска-палітычнага, таксама культурнага і мастацкага развіцця Вялікага Княства Літоўскага. Так у выяўленчым мастацтве Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XVI – пачатку XVII ст. пад уплывам ідэй Рэнесансу складаецца самастойны жанр параднага шляхецкага партрэта, які атрымаў назву «сармацкага». Агульная асаблівасць сармацкага партрэта – павышаная ўвага да пратакольнай дакладнасці і партрэтнай характарыстыкі. Сармацкі партрэт адлюстроўваў разуменне заказчыкам-феадалам ролі і месца сябе і свайго роду ў гісторыі, грамадстве, дзяржаве і, нават, у будучыні, звычайна ў паэтычна прыўзнятай афарбоўцы. Стваральнікамі сармацкага партрэта былі пераважна ананімныя цэхавыя мастакі, але захаваліся і імёны некаторых жывапісцаў: І. Шрэтар, Д. Шульц і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[6, с. 401–402]. Сармацкі партрэт адлюстроўваў пераважна вобраз «homo militans» (лац. чалавек-воін), паказваў ролю ваенна-феадальнага саслоўя ў дзяржаве і перадаваў паэтыку яго гераізаванага светаўспрымання.

Элементам рыцарскага вобраза, які адлюстраваны на сармацкіх партрэтах, была дэманстрацыя добрай фізічнай падрыхтоўкі, вайсковай выпраўкі, мудрасці і вопытнасці шляхціца. На партрэтах Льва Сапегі (1617), Хрыстофа Весялоўскага (1636), Анджэя Казіміра Завішы (1676), Яна ІІІ Сабескага (1686) мы бачым людзей фізічна прыгожых і моцных, талент якіх раскрываўся на ваеннай ніве: яны былі прыроджанымі, падрыхтаванымі, загартаванымі ў бітвах ваярамі і абаронцамі сваёй Айчыны. Яскравым прыкладам служыць партрэт Юрыя І Радзівіла першай паловы XVII ст. работы невядомага мастака (калекцыя НММ РБ). За перамогі больш чым у 30 бітвах Юры І Радзівіл атрымаў ганаровае імя Геркулеса Літоўскага. Невядомы жывапісец знайшоў ідэальную адпаведнасць характару героя, перададзенага ў імені Геркулес, яго мастацкаму ўвасабленню, надаў выяве ўрачысты, прыўзняты настрой, падкрэсліў стрыманую моц і магутнасць героя.

Дзеці князёў, магнатаў, шляхціцаў ужо з 12 гадоў былі ў войску, неслі вайсковую службу і ўспрымаліся па-даросламу. Менавіта прыкмета «дарослыя» пераважала ў сармацкіх партрэтах дзяцей XVII–XIX стст. Яркім прыкладам з’яўляецца партрэт Феліцыяна Вольскага (XIX ст.) невядомага мастака. На карціне юнак намаляваны статычна і выглядае як дарослы чалавек. На ім апрануты сюртук, падбіты і аблямаваны гарнастаем; з таго ж футра вялікі адкладны каўнер. У правай руцэ ён трымае капялюш, локцем левай рукі абапіраецца на балюстраду. У яго твары, у постаці – гонар за сям’ю, веданне свайго паходжання, велічная застыласць; жэсты рук урачыстыя. Перад намі выява чалавека, перапоўненага пачуццём уласнай годнасці, прадстаўніка шляхецкага саслоўя, homo militans, які ведае і годна нясе свой абавязак перад Айчынай.

Здзіўляе «дарослыя» дзіцяці, намаляванага на партрэце. У тыя далёкія часы шляхецкія сыны сталелі раней. Іх дзяцінства было даволі суровым. Да васьмі гадоў юнак павінен быў навучыцца валодаць зброяй, ездзіць вярхом на кані і лёгка пераносіць цяжкасці ваеннага жыцця, ведаць гісторыю войнаў, узбраенне, тактыку і стратэгію бою. Першапачатковая ваенная падрыхтоўка адбывалася дома, а потым непасрэдна ў баявой дзейнасці на гэтак званых попісах, калі збіралася ўсё дваранства і вызначалася гатоўнасць шляхты да баявой дзейнасці. Такую практыку замацаваў яшчэ вялікі князь Вітаўт. Ён прымушаў шляхту нейкі час быць улетку ў лагерах, дзе праводзіліся ўсе магчымыя практыкаванні, да прыкладу, скачкі ўначы на перасечанай мясцовасці на адлегласць да 20 кіламетраў, пераправы праз рэкі. Некаторыя багатыя бацькі на нейкі час адсылалі сваіх сыноў у сялянскую сям’ю, каб дзіця загартавалася і па-сапраўднаму спазнала жыццё. Гэтак жа, напрыклад, паступілі з Алесем Загорскім, літаратурным героем рамана Ў. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» [7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сармацкі партрэт на землях Вялікага Княства Літоўскага ідэалізаваў чалавека воіна homo militans. Нават у партрэтах дзяцей XVII–XVIII стст. мадэль перадавалі па-даросламу, што захавалася ў працах правінцыйных мастакоў XIX ст., якія карысталіся схемай сармацкага партрэта, фотаздымках канца XIX – пачатку XX ст. Такім чынам, у шляхецкім жыцці, выхаванні вялікая ўвага ўдзялялася фізічнай сіле, маральнай моцы, тактыцы, гісторыі войнаў, патрабавала пры любых абставінах паводзіць сябе годна, па-шляхецкаму. Вайсковая падрыхтоўка з'яўляўся адным з характэрных і важных элементаў традыцыйнай культуры шляхты Вялікага Княства Літоўскага.


1. *Бохан, Ю.М.* Турнірныя традыцыі ў Вялікім Княстве Літоўскім у 14–16 стст. / Ю.М. Бохан. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2008. – 76 с.

2. *Высоцкая, Н.Ф.* Жывапіс Беларусі XII–XVIII / Н.Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1980. – 315 с.

3. *Лазука, Б.А.* Гісторыя мастацтваў / Б.А. Лазука. – 2-ое выд., дапрац. – Мінск : Беларусь, 2003. – 399 с.

4. *Повязь* часоў. 100 партрэтаў XVI–XX стагоддзяў са збору нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008.

5. *Тананаева, Л.И.* Сарматский портрет. Из эпохи польского портрета эпохи Барокко / Л.И. Тананаева ; под ред. В.Н. Прокофьева. – М. : Наука, 1979. – 304 с.

6. *Хадыка, А.Ю.* Партрэт сармацкі ВКЛ / А.Ю. Хадыка. Энцыклапедыя. – Т. 2. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2007. – С. 402.

7. *Шамак, А.* Традыцыйная фізічная культура беларусаў / А. Шамак [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://archive.svaboda.org/prahram/spad/ns0601.html – Дата доступу : 06.06.2012.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ